Жыві, Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

№ 170 (183) 31 жніўня 1991 г. Субота.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.

В Президиуме Совета Министров БССР

Состоялось заседание Президиума Совета Министров Белорусской ССР. Обсужден проект постановления «О некоторых неотложных мерах по выполнению Закона Белорусской ССР «О придании статуса конституционного Закона Декларации Верховного Совета БССР о государственном суверенитете Белорусской Советской Социалистической Республики» и постановления Верховного Совета БССР «Об обеспечении политической и экономической самостоятельности Белорусской ССР».

По представленному документу высказано целый ряд предложений и замечаний. Президиум поручил в пятидневный срок доработать данное решение и представить его для окончательного утверждения.

Рассмотрен ход уборки урожая, заготовки картофеля, корнеплодов и других сельскохозяйственных культур. Как отметил министр хлебопродуктов Н. С. Якушев, выполнение государственного заказа по заготовке зерна находится под угрозой срыва. Ряд районов Брестской, Гродненской, Могилевской областей нарушают договорные обязательства, а то и вовсе прекращают поставки зерна в государственные ресурсы. Отмечено, что в случае невыполнения госзаказа по поставке зерна, к должностным лицам будут приняты самые строгие меры воздействия, вплоть до освобождения от занимаемых должностей. Данное положение распространяется и на руководителей промышленных предприятий, которые поставляют материально - технические ресурсы и товары народного потребления в республиканский фонд стабилизации рынка для стимулирования продажи зерна.

На зсаедании Президиума отмечена добросовестная работа властей города Полоцка по сохранению культурно - исторического наследия. Правительством республики приняты дополнительные меры по дальнейшей реставрации и сохранности исторических памятников культуры и искусства г. Полоцка.

Служба информации Совета Министров БССР.

Факты Аргументы Коммен-тарии Суждения

Гвардейцы, шаг вперед!

Командующий КБВО генерал-полковник Костенко сообщил, что Белоруссия планирует создать национальную гвардию.

Как сказал командующий, национальная гвардия будет защищать исключительно интересы республики.

Ордер с «нагрузкой»

ГОМЕЛЬ. **В одной из квартир по улице 60 лет СССР санстанция Советского района обнаружила наличие... ртути.**

Эту двухкомнатную квартиру получил по ордеру гомельчанин Б. Бывшие ее хозяева — теперь уже за «кордоном». Так что откуда взялся в квартире вредный для здоровья металл, сказать трудно. Очевидно, другое: жить в ней без специальной обработки комнат нельзя.

Молоко для чернобыльцев

МОЗЫРЬ. **Теперь даже в самые отдаленные деревни, пострадавшие от чернобыльской катастрофы, будут регулярно завозить молоко.**

Вчера на гормолзаводе была пущена новая импортная линия по стерилизации и упаковке молока в литровые пакеты.

— Главное достоинство ее в том, что молоко в пакетах может храниться до 20 дней.

Первая ласточка

В Комиссию Верховного Совета БССР по международным делам и внешнеэкономическим связям позвонил посол Нидерландов в СССР.

Он поздравил с провозглашением государственной независимости республики и попросил выслать все законодательные акты, касающиеся этого события.

Посол намерен ознакомить с ними участников ближайшей сессии Европейского экономического сообщества. Документы отправлены в посольство Нидерландов.

Двойной праздник миллионеров

РЕЧИЦА. Накануне профессионального праздника работников нефтяной и газовой промышленности здесь состоялось и еще одно торжество. Посвящено оно 25-летию объединения «Белоруснефть». За четверть века нефтяники добыли для народного хозяйства страны 86 миллионов тонн.

Перевернем последнюю страницу

САН-ФРАНЦИСКО. Исследовательский институт по изучению войны, революции и мира имени Гувера Стэнфордского университета решил прекратить выпуск ежегодника по международному коммунистическому движению. «Нам кажется, что этот справочник себя исчерпал», — заявила Маргит Григори, редактор ежегодника.

Хлеб будет. Из-за рубежа

МОСКВА. **Как сообщил журналистам президент Научно-промышленного Союза СССР Аркадий Вольский, в настоящее время в стране заготовлено примерно 25 миллионов тонн зерна.**

Для того, чтобы прокормить население до следующего урожая, необходимо иметь 85 миллионов тонн.

По словам А. Вольского, СССР будет вынужден ныне импортировать пшеницу в тех же объемах, что и в предыдущие годы.

В двух словах

● Органами Прокуратуры РСФСР задержан Анатолий Лукьянов. В его рабочем кабинете произведен обыск.

● Верховный Совет СССР утвердил Указ Президента СССР от 22 августа 1991 года «Об освобождении Павлова В. С. от обязанностей премьер-министра СССР» в связи с возбуждением в отношении его Прокуратурой Союза ССР уголовного дела за участие в антиконституционном заговоре.

● Верховный Совет СССР отменил особые полномочия, предоставленные Президенту М. Горбачеву.

● Советский Союз обратился к странам Европейского сообщества и к группе семи ведущих индустриальных держав с просьбой о продовольственной и финансовой помощи.

● Заместитель министра иностранных дел СССР заявил послу Румынии в Москве Сандру, что решение о придании Молдове статуса независимой республики является прерогативой Советского Союза.

Страсти по детскому питанию

МИНСК. **Около тридцати женщин перекрыли движение по проспекту Машерова. Подобных случаев раньше в городе не было. Что же произошло!**

По словам очевидцев, женщины пришли в универсам «Заславль», в надежде хоть в конце месяца купить детское питание. Однако от продавцов услышали — ничего на складе нет, и когда будет, неизвестно. Вот тогда и возникла отчаянная мысль — хоть как-то обратить на себя внимание. Транспорт не ходил в течение получаса. На этот раз конфликт удалось уладить. В магазин завезли 2 тысячи банок яблочно-абрикосового джема. Правда, его хватило лишь немногим.

Как сообщили нам в Минсельхозпроде, проблема эта очень острая. По рекомендациям Минздрава БССР, республике нужно 167 миллионов банок детского питания в год. Фонды же выделены только на 33 миллиона. Однако и это, оказывается, лишь мечта. Планы собственного производства сорваны, не выполнили торговых обязательств Армения с Грузией. Между тем белорусское правительство спокойно похоронило готовые проекты столь необходимых заводов в Полоцке и Мостах. И теперь, по всему видно, может сорваться выгодная сделка с итальянской фирмой о закупке специального оборудования. Не выделена валюта. Что в подобной ситуации собирается предпринимать правительство — неясно. Но как себя поведут матери, сомнений, кажется, не вызывает.



Рисунок Олега ПОПОВА.

Говорят, у Гидаспова есть «наган»...

Как сообщили из аппарата мэра Ленинграда, Анатолию Собчаку в Москву позвонил первый секретарь обкома КПСС бывший член ленинградского ГКЧП Борис Гидаспов.

Он пригрозил, что если следователи с ним будут обращаться как с преступником, он покончит с собой. По данным, полученным от руководства ленинградской милиции и подтвержденным некоторыми сотрудниками бывшего обкома КПСС, у Бориса Гидаспова имеется револьвер системы «наган».

Прогулял? Отработай!

МАГНИТОГОРСК. **С интересным предложением к работникам калибровочного завода обратился директор этого предприятия В. Кривощапов. Суть идеи—предоставить калибровщикам право «прогулять» любые два дня в месяц, естественно, с дальнейшей их отработкой.**

«Не секрет,—отметил директор,—что как минимум два раза в месяц каждый работник отпрашивается раньше времени или просит увольнительную». Это новшество заимствовано из опыта предприятий ФРГ, где каждый работник пользуется такими льготами.

Выпуск подготовлен по сообщениям Виктора ЛЕЩЕНКО, Анатолия ГОТОВЧИЦА, Вацлава БОГДАНОВИЧА, Леонида ФАДЕЕВА и агентств «Инфо-нова» и «Урал-акцепт».

«Горячий» телефон 32-24-02 работает ежедневно с 9 до 11 часов.

З месца падзеі

МІНСК. ДЗЕВЯТЫ ДЗЕНЬ ЖАЛОБЫ...

Дзевяты дзень жалобы... Менавіта гэта хрысціянская традыцыя прывяла ў чацвер вечарам тысячы мінчан на пляц перад Домам урада.



Мітынг пачаўся жалобнай паніхідай па тых, хто загінуў у Маскве ў дні путчу. На трыбуну падымаюцца святары Георгій і Ян. Гучаць словы малітвы па забітых — папярэджанне для жывых. У кароткім слове ойча Ян заклікаў прысутных да пакаяння, адпушчэння грахоў. Боская кара чакае ўсіх тых, хто з чорнай душой, хто падтрымаў уголас ці моўчкі шайку д'яблаў, якія рыхтавалі нам вярыгі і рабства, патоп на шостай частцы свету. Тут жа да прысутных з кароткімі прамовамі звярнуліся народныя дэпутаты БССР Сяргей Навумчык і Валянцін Голубеў.

Затым адбылося шэсце па праспекту да будынка ЦК КПБ, дзе і адбыўся мітынг. Не ведаю, ці бачыў гэты грозны манументальны дом столькі людзей на сваім вяку, ці чуў ён такія прамовы. Як зазначыў народны дэпутат Яўген Новікаў, балюча ўспамінаць, што яны зрабілі з намі, з нашым народам. Уся барацьба яшчэ наперадзе. Яны ўсюды. Іхнія людзі ва ўсіх установах. Яны толькі прытаіліся часова.

Прадстаўнік Мінскага стачкама Уладзімір Феакцістаў зазначыў, што ў цяжкія хвіліны Расію прадалі не рабочыя, а беларуская хунта на чале з гаспадарамі гэтага будынка. Ён заклікаў да яднання і пільнасці.

Сябра згуртавання беларусаў у Эстоніі Лявон Валуй зазначыў, што толькі вольная Беларусь зможа ўвайсці ў сям'ю еўрапейскіх народаў, што незалежная Эстонія вітае і падтрымлівае памкненні Беларусі да сапраўднага суверэнітэту і незалежнасці.

«Я правёў два дні ў гэтым будынку, — так пачаў выступленне Анатоль Гурыновіч, першы намеснік старшыні Мінгарсавета. — Гэта вельмі прыгожы будынак унутры. Не, не за ўзносы ён пабудаваны, а за нашы мазольныя рублі. Таму і павінен служыць народу і толькі народу». Далей ён зачытаў Зварот да грамадзян Беларусі ўдзельнікаў рэспубліканскай нарады дэпутатаў дэмакратычнай арыентацыі ўсіх узроўняў, які прыняты 29 жніўня.

Відаць, яшчэ рана святкаваць перамогу. Такі лейтматыў гучаў у выступленні Зянона Пазьняка. Ён гаварыў, што рашэнні нечарговай сесіі трэба падтрымаць актыўнымі дзеяннямі на ўсіх узроўнях, ствараць пры мясцовых органах улады дэпутацкія камісіі па высвятленню фактаў падтрымкі дзейнасці ГКЧП службовымі асобамі і арганізацыямі, а пры неабходнасці склікаць надзвычайныя сесіі мясцовых Саветаў, неадкладна вярнуць нарабаваную маёмасць народу, вывесці злачынцаў на чыстую ваду, а не чакаць, пакуль зноў недабіткі перагрупуюцца і пяройдуць у наступ.

Сапраўды, гісторыя падаравала нам унікальны шанц. І не выкарыстаць яго — таксама злачынства. Нельга марудзіць, сілы рэакцыі яшчэ даволі моцныя, яны на час прыціхлі, прытаіліся і гатовы да новага ўжо смяротнага скачка.

Іван РУБІН.

Фота Сяргея ГРЫЦА.

В Комиссии Верховного Совета БССР по оценке деятельности членов ГКЧП и поддержавших их общественно-политических образований, органов государственной власти и руководства, должностных лиц и граждан

В прокуратуре БССР

Приступила к работе временная Комиссия Верховного Совета БССР. Члены комиссии разъехались по всем регионам республики для того, чтобы проверить деятельность должностных лиц во время государственного переворота.

Первые сообщения, поступающие в Комиссию, позволяют сделать вывод, что особенно «отличились» некоторые деятели приостановленной КПБ. Да и целый ряд хозяйственников оказались, к сожалению, не на высоте. Особенно недостойную позицию заняли руководители средств массовой информации, уже и после подавления путча продолжавшие печатать фальшивки, призывающие «одобрять и поддерживать» государственных преступников.

Прокуратура республики возбудила уголовное дело.

В. В. Соболев, возглавляющий расследование, сообщил, что в составе группы—наиболее квалифицированные следственные работники республики. В процессе расследования будут выявлены все факты противоправных действий должностных лиц с последующей их оценкой.

В Комиссию поступает немало письменных и устных заявлений, которые свидетельствуют, что люди не совсем верно оценивают обстановку, боятся расправ за сказанное где-то неосторожное слово или суждение. Этого не следует опасаться. За мнение, за убеждение, за политические пристрастия к ответственности, естественно, никто привлекаться не будет. Это следует заявить однозначно! И Комиссия, и следствие исследуют лишь конкретные антиконституционные деяния. Еще раз необходимо подчеркнуть, что всевозможные доносы и сведение счетов, анонимки и прочие реликты тоталитарного прошлого игнорируются и следствием, и Комиссией Верховного Совета.

Между тем поступают следующие сообщения. 28 августа с ведома некоторых должностных лиц Молодечно были вскрыты кабинеты райкома партии, изъяты документы, после чего двери были опечатаны вновь. Исполком Молодечненского горсовета народных депутатов дал серьезную оценку этим действиям, строго наказал начальника городского отдела внутренних дел В. Симана и передал материалы в прокуратуру для принятия мер.

Аналогичные факты произошли и в некоторых других городах республики. Комиссия предостерегает тех, кто считает, что можно игнорировать принятые Верховным Советом законы, приостановившие деятельность компартии. Виновные будут привлекаться к строгой ответственности.

В распоряжение Комиссии поступает информация о том, что в Витебске работники приостановленной КПБ оказывают давление на администрацию высших учебных заведений города с тем, чтобы «переметнуться» в преподавательские ряды. Это создает определенную напряженность. Дело в том, что в учебных заведениях города создалась и без того напряженная кадровая обстановка и потому этот нажим вчерашних высокопоставленных, но не потерявших связей людей недопустим.

По каждому подобному факту Комиссия будет принимать меры.

В этой связи вообще следует сказать, что бывшие партработники должны реально оценивать сложившуюся ситуацию и уяснить, что мы приходим, наконец, к пониманию того, что протекционизм и номенклатурные игры должны безвозвратно уйти в прошлое. Довольно опираться на связи и «мохнатую руку» и видеть себя исключительно в руководящем кресле. Белоруссии нужны честные компетентные профессионалы, а не специалисты «по общему руководству».

Особое внимание и Комиссии и следственной группы привлекает деятельность средств массовой информации. Первые дни расследования дают немалый материал для серьезных выводов. Следствию предстоит выяснить, чем руководствовались руководители газет, радио и телевидения — злым умыслом или столь характерной для некоторых редакторов обычной коньюнктурой?

К открытию съезда

Внеочередной пятый съезд народных депутатов СССР открывается 2 сентября 1991 года в 10 часов утра в Кремлевском дворце съездов.

Нам стала вядома

Аж не верыцца...

Прамое забеспячэнне Іванаўскага раёна прыродным газам — даўняя мара яго жыхароў.

А цяпер прыйшла пара гаварыць аб ажыццяўленні задумы. Ужо больш-менш дакладна вызначаны час, калі ўзбоч Іванава ляжа магістраль Кобрын—Пінск—тая самая магістраль, якая і прынясе гораду доўгачаканае блакітнае паліва. Гэты час не за гарамі — наступіць ён у 1992 годзе.

Сёння ж раённыя службы распачалі падрыхтоўку да стварэння сваёй сеткі газазабеспячэння, атрымалі ўжо і адпаведную схему з БелНДІгіпрасельбуда.

Анатоль КРЭЙДЗІЧ.

Роздум пісьменніка

Святкаваць перамогу яшчэ рана

Няхай прабачыць мне шаноўны чытач, што свае нататкі пачынаю з асабістага. Але інакш нельга. Сёння асабістае настолькі цесна пераплялося з агульналюдскім, што аддзяліць яго немагчыма.

Вось яно, гэтае асабістае: «Партыйнай арганізацыі Саюза пісьменнікаў Беларусі ад Законнікава С. І.

ЗАЯВА

Я быў членам КПСС васемнаццаць гадоў. Не перакрэсліваю ўсё добрае, што здзейснена за гэты час у краіне і нашай рэспубліцы сумленнымі, працавітымі людзьмі, у тым ліку і многімі членамі партыі. Аднак атмасфера дыктату, фальшу, хлусні, дэмагогіі, угодніцтва і кар'ерызму, якая ў першую чаргу ствараласся і падтрымлівалася партыйнымі органамі, прывяла наша грамадства да крызісу ў палітычным, эканамічным, сацыяльным і духоўным жыцці.

Нічога не змянілася ў лепшы бок і з прыходам перабудовы. Наадварот, пачалося і працягваецца шальмаванне ў партыйным друку прадстаўнікоў інтэлігенцыі, усіх дэмакратычных сіл, даходзіла і да прымянення фізічнай расправы. Непрыглядная, двурушная пазіцыя многіх вышэйшых партыйных кіраўнікоў яскрава праявілася ў іх адносінах да вырашэння чарнобыльскіх праблем, да праграмы нацыянальнага адраджэння, развіцця роднай мовы і культуры, у час перадвыбарчай і выбарчай кампаній. На шматлікія звароты інтэлігенцыі ў ЦК КПБ не было нават адказу. Спадзевы, што будзе нейкі паварот да шчырасці, прынцыповай і разумнай ацэнкі становішча на XXXI з'ездзе КПБ, аказаліся марнымі. Верх узялі кансерватыўныя, рэакцыйныя сілы, якія ўмела выкарысталі апаратныя гульні для навязвання сваёй волі.

Крывавыя падзеі ў розных рэгіёнах краіны і асабліва ў Прыбалтыцы сведчаць пра нязменнасць курсу КПСС на дыктат, прымяненне ваеннай сілы, пра нежаданне прыслухацца да думкі і голасу народаў, якія не хочуць болей жыць ва ўмовах нацыянальнага прыніжэння, рэпрэсій, страху, жабрацтва і разрухі. Кволыя парасткі дэмакратыі могуць быць растаптанымі дыктатурай. Як пісьменнік і грамадзянін я ў гэты трывожны час павінен зрабіць выбар, адстойваць, што б ні здарылася, дэмакратычныя прынцыпы, праўду і справядлівасць, незалежнасць і годнасць свайго народа.

Лічу для сябе амаральным падтрымліваць тую партыю, дзе галасы радавых яе членаў нічога не вырашаюць, а велізарная армія партыйных функцыянераў старой закалкі, якая па-ранейшаму ўзурпіруе ўладу, працягвае праводзіць таталітарысцкую, антыдэмакратычную, антынацыянальную, антынародную палітыку.

28 студзеня 1991 года».

Адразу ж паслужлівыя партыйныя клеркі даставілі гэты дакумент у ЦК КПБ...

Але я працытаваў радкі заявы не дзеля таго, каб пакрасавацца, вось, маўляў, які адважны ўчынак зрабіў. Не! Там былі вельмі важныя словы пра дыктатуру, таталітарызм. Не адзін я, мільёны людзей пра гэта трывожна думалі, гэтага баяліся, гледзячы, як імкліва набірае сілу рэакцыя, хоць не ўсе гаварылі адкрыта. І яно адбылося. Па-зладзейску, ноччу групай самазванцаў была зроблена спроба захапіць у краіне ўладу. Тры страшныя дні і ночы цягнуліся, як вечнасць.

І вось усе сумленныя людзі, аглушаныя, шакіраваныя весткай пра пераварот, нарэшце ўздыхнулі з палёгкай, калі пачулі, што авантура сарвана, што дзяржаўныя злачынцы арыштоўваюцца, што з вуліц Масквы, Ленінграда, Вільнюса, Рыгі і Таліна выведзены баявая тэхніка і войскі.

Мы перажылі разам з гераічнымі масквічамі, расіянамі хвалюючыя хвіліны, гледзячы на ажыўшыя экраны тэлевізараў, з якіх ужо не вяшчалі дыктараў з цвердакаменнымі, змрочнымі тварамі і мінорна-ўрачыстымі галасамі, а паказвалася сапраўды грандыёзнае відовішча — мітынг пераможцаў.

Сёння ў нашых сэрцах — радасць і глыбокая ўдзячнасць мужнаму і рашучаму Прэзідэнту Расіі Б. М. Ельцыну і яго надзейным паплечнікам, адважным масквічам, расіянам, тым афіцэрам і салдатам, якія дапамаглі ім выстаяць.

Цяпер, калі мы крыху ачуняліі ад стрэсу, які абрынуўся на нас у гэтыя трагічныя дні, калі аціхае хваля эйфарыі, неабходна сур'ёзна думаць: як жыць далей? Што ж высвеціў, якія ўрокі даў нам пераварот?

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Народная газета

Накануне события

Демократия защищена. Но народ все страдает...

Президиум совета Федерации профсоюзов Белоруссии принял решение провести в сентябре Дни единых профсоюзных действий за права и интересы трудящихся. Поскольку в республике такое мероприятие проводится впервые, мы попросили рассказать о нем заведующего отделом совета ФПБ Анатолия СУШУ.

— Решение о Днях принято еще 16 августа, до трагических событий. Причины ясны. И они отнюдь не устранены сегодня. Углубляются кризисные явления в экономике, всеобщий дефицит, налицо стремительное падение жизненного уровня людей, неспособность органов государственной власти стабилизировать цены и положение на потребительском рынке. Нас глубоко беспокоит и то, что законодательные органы постоянно запаздывают с разработкой и принятием законов и нормативных документов, защищающих права и обеспечивающих гарантии для трудящихся. Особенно остро мы все это ощущаем сейчас, когда Декларации о государственном суверенитете Белорусской ССР придан статус конституционного акта. А ведь, как известно, мы пока не имеем многих жизненно необходимых законов, и в первую очередь в сфере правового регулирования труда.

Нас не может не беспокоить и то, что не принят Закон БССР «О профессиональных союзах». Необходимость же его подтверждена самой жизнью. И поэтому основная цель проведения Дней единых действий профсоюзов в том, чтобы привлечь внимание органов законодательной и исполнительной власти всех уровней к вышеназванным проблемам.

В эти дни будут проведены встречи работников совета ФПБ, советов областных объединений профсоюзов, республиканских, областных и районных комитетов и советов отраслевых профсоюзов с профактивом первичных организаций, трудовыми коллективами. Пройдут приемы граждан, будет оказана практическая помощь в вопросах внутрипрофсоюзной деятельности, организации, оплаты и охраны труда, разрешения конкретных социально-экономических вопросов, трудовых споров, даны юридические консультации.

Планируется проведение комплексных проверок условий труда на производстве, экологического состояния окружающей среды, подготовки к зиме. Итоги проверок будут рассмотрены совместно с руководителями предприятий, министерств, ведомств и приняты меры по быстрейшему устранению недостатков. Предполагается оказать помощь сельчанам в уборке урожая.

Профсоюзные активисты побывают в специнтернатах, детских домах, домах престарелых и госпиталях инвалидов войны, навестят многодетные семьи и семьи погибших на производстве, при исполнении воинского и гражданского долга. Им будет оказана материальная, медицинская и другая помощь, организованы концерты, переданы книги, культурный и спортивный инвентарь, подарки.

Надеемся, что многие трудовые коллективы сделают перечисления в благотворительные фонды. С целью их пополнения будут организованы благотворительные платные концерты, спортивные соревнования, пройдут аукционы, выставки-продажи изделий народных умельцев и т. д.

На площадях, в парках, скверах, на улицах, во Дворцах культуры, клубах и библиотеках намечено организовать выступления коллективов художественной [illegible] творчества, [illegible] кроссы, эстафеты, со[illegible]

Надеемся [illegible] ное участие [illegible] трудя[illegible] жителей республики.

По поводу

Послесловие к юбилею, навевающему смешанные чувства

В августе 1931 года Совет народных комиссаров БССР утвердил Положение Белорусского объединения глухих. Эта дата стала днем рождения БелОГ. Тогда органы социального обеспечения помогли 3,5 тысячи глухонемых.

Трудоустраивали инвалидов по слуху в основном на государственных заводах и фабриках, но многие из членов общества работали на первых учебно-производственных предприятиях.

Ныне на 10 учебно-производственных предприятиях БелОГ работает более трех тысяч человек, более четырех тысяч — в системе государственной промышленности, более тысячи — в сельском хозяйстве. Крупные первичные организации БелОГ есть на Минском автозаводе, в производственном объединении «Минский тракторный завод», на «Гомсельмаше», Брестском электроламповом и других предприятиях республики.

Учебно-производственные предприятия БелОГ размещаются в Минске, Гомеле, Гродно, Бресте, Витебске, Бобруйске, Могилеве, Борисове, Орше, Барановичах. Это современные предприятия, выпускающие радиотехнические, швейные и другие изделия.

Но, увы, далеко не все у нас гладко.

Конечно, жизнь глухого человека омрачена тем, что для него угасает мир звуков. Это тем более обидно, что до сих пор слабослышащему, взрослому и ребенку, трудно приобрести слуховой аппарат, другую звукоусиливающую аппаратуру; так же трудно ее отремонтировать. О дефиците батареек для слуховых аппаратов и говорить не приходится. Центральное правление БелОГ ищет пути решения этих проблем, в век компьютерной техники мы не можем оставить без помощи тех, кто благодаря приборам может слышать музыку, голос, шелест листвы и шум дождя. Особенно тревожит нас положение со звукоусиливающей аппаратурой для детей. Известно, что чем раньше они научатся пользоваться ею, тем лучше будут говорить, тем больше шансов сохранить у них остатки слуха. В этом плане непонятна позиция белорусских радиозаводов, радиоинститута. Надо проявить добрую волю и милосердие, ведь мы умеем делать усиливающую аппаратуру не хуже заграничной!

Рынок и хаос в экономике сказались на слабых. Более 1300 членов общества стоят на очереди на получение квартир. Нам задолжали некоторые исполкомы, которым мы перечислили деньги, а квартиры в срок не получили.

Не пора ли вспомнить о долгах?

Николай ШИРКО,
председатель ЦП БелОГ.

Видит око

Вы здесь не стояли!

Небольшая очередь за двухместными палатками в магазине спорттоваров мгновенно разбухла: почти у каждого нашлись знакомые, тоже пожелавшие стать туристами...

— Вы здесь не стояли! — негодовала пожилая дама из середины хвоста, адресуя свои возгласы каждому, кто пытался протиснуться к товару в обход других. Наконец, она не выдержала и пошла к кассе, чтобы наводить порядок. Но, оказавшись впереди, сама протянула деньги продавщице: «Мне две палатки. Я здесь с внучкой...»

Каков характер! Пока стояла в очереди, взывала к справедливости. Как только удалось хитростью пробиться к прилавку, все заслонил личный интерес. Не напоминает ли это путь некоторых доморощенных политиков к высокому креслу, к вожделенной «кормушке»?

Не каждому по погону

Что может купить служивый в Витебском гарнизонном универмаге?

Кое-что из обмундирования, знаки отличия родов войск, погоны и звездочки к ним. Стал лейтенантом — добавляй вторую звездочку, старшим — третью. Больше всего их по счету у капитана, целых четыре. Но вот рядом с погонами — товар аж с семью звездочками: коньяк семилетней выдержки. И не выпьеш, а покачнешься — 113 рублей за поллитра! Впрочем, тут же стоит маленькая бутылочка импортной туалетной воды, так она еще дороже.

В общем, джентльменский набор для офицера: надел новые погоны, «обмыл» коньяком, а наутро освежился заграничным лосьоном. Только вот не интересуется никто дорогими жидкостями. Уж больно крупные звезды надо на погонах иметь для таких покупок. Но генералы в этот магазин не заходят.

«Веселый» дом

Не позавидуешь новоселам многоквартирного жилого дома, этажи которого растут рядом с витебским стадионом для военизированных видов спорта.

Правда, стадион тоже еще не вполне готов, но печальная перспектива очевидна. Неужели проектировщики и подрядчики не знали, какое соседство готовят будущим жильцам: на треке стадиона будут проходить тренировки и соревнования мотогонщиков. Знали, но стройка началась и продолжается. Говорят, что в квартирах собираются установить дополнительные оконные рамы. А не лучше ли поселить там горе-проектировщиков? Или одних только страстных мотоциклистов?

Откуда дровишки?

Из лесу, вестимо, как писал отечественный классик. Покончив с заготовкой сена для своих коров, сельские жители двинулись на лесосеку.

Большие деревья, как правило, не губят. Вырубают ольху, хвойный сухостой, подбирают бурелом. Хорошо, если в доме нестарый хозяин или помогает городская родня. А иначе тяжело. В лесу раздается топор дровосека, а потом видишь: плетутся к деревне старик со старухой, на плечах — вязанки мелко порубленного валежника. Благо, недалеко, так что ходка за ходкой — глядишь, и натаскают на зиму.

В этом году придется и горожанам на свои силы рассчитывать. Польша в угле отказала, торфобрикетные заводы и лесхозы работают вполсилы. Потому Витебский облисполком, например, разрешил всем, кому не лень, рубить на дрова поваленные ветром или старостью деревья. Причем бесплатно. Так что беритесь за топор, владельцы частных домов. Не ждите чуда до белых мух.

Степан СТАРОЖИЛ.







Майстры

...І заквітнела на кавадле ружа

У раённым цэнтры Глыбокае адбылося II Усебеларускае свята мастацкага кавальства.

Так здарылася, што сёлета яно супала з традыцыйным усесаюзным святам у Балашысе, якое праводзіцца на базе музея кавальскай навукі і тэхнікі. І ўсё ж той-сёй з майстроў Тулы, Суздаля, Масквы аддаў перавагу менавіта Глыбокаму зусім не выпадкова, бо былі яны тут летась — узровень беларускіх майстроў і гасціннасць прыйшліся па душы.

... Ёсць нейкая свая, асаблівая прыгажосць і паэзія ў самім працэсе такога мужчынскага і далёка не самага лёгкага з заняткаў, як кавальства. Адчуванне гэтага прыходзіць, калі бачыш, як працуюць віртуозы-прафесіяналы Валерый Копцеў з Тулы, Стасіс Бібікас з Вільнюса ці сам гаспадар і арганізатар свята Аляксандр Дубіна—у пластыцы кожнага руху прачытваецца свая гармонія, музыка. І гэтым ты ўжо неяк падрыхтаваны да выніку самой работы, але ж не перастаеш здзіўляцца цуду, які адбываецца на вачах, — палоска распаленага металу набывае акрэсленыя абрысы — вось бачны нейкі інструмент (заказ гравёра Сяргея Лабанава), а на суседнім кавадле распускае пялёсткі ружа...

Майстры дзяліліся сваімі прыёмамі, сакрэтамі, і такая заразлівая творчая атмасфера ўсталявалася, што не вытрымаў прафесар кафедры «Машыны і тэхналогія апрацоўкі металу ціскам» Беларускай політэхнічнай акадэміі Яўген Барысавіч Лажэчнікаў, стаў да горана. Нехта, уладкаваўшыся побач, разглядаў слайды — гэта, як высветлілася, работы братоў Абдулаевых, майстроў па ўсходняй зброі з Душанбе. Ляцелі яны на свята самалётам, а зброю, як вядома, паветраным караблём транспартаваць нельга. Але і слайды даюць уяўленне аб іх высокім майстэрстве.

Мінчанам Г. Асташонку, А. Баглаю, Ю. Гудзіновічу, М. Дубатоўку прасцей, яны не былі звязаны з Аэрафлотам, таму ўсе ўдзельнікі свята змаглі пабачыць калекцыю рэканструяванай старажытнай зброі, якая зроблена імі для Мірскага замка. Тут жа побач на выставе — вытанчаныя розы каваля з уральскага горада Ніжняя Тура А. Нырабцава, адмысловыя формы са шкла і металу беларускага дызайнера А. Міхалевіча, калекцыя кавальскіх вырабаў запаведніка «Заслаўе»...

Былі прадстаўлены на свяце ў фотаздымках і работы саміх глыбоцкіх майстроў, але ўсе, хто жадаў, маглі пабачыць некаторыя з іх у натуры, гуляючы па вуліцах райцэнтра ці зазірнуўшы ў Дом рамёстваў. За тры гады горад набыў своеасаблівае, арыгінальнае аблічча дзякуючы менавіта ім, аб'яднаным у кааператыў «Дэкор».

Магчыма, трэцяе свята кавальства набудзе нейкія новыя абрысы. Так, прафесар Я. Лажэчнікаў, які да ўсяго з'яўляецца старшынёй рэспубліканскай секцыі апрацоўкі металу навукова-тэхнічнага таварыства Машпрома, мае намер прыцягнуць да ўдзелу буйныя багатыя прамысловыя кузні.

А ў самога Аляксандра Дубіны вось якая новая задума: стварыць у Глыбокім кавальска-культурны цэнтр з музеем, вучэбным цэнтрам, майстэрнямі («да чаго дажыліся, у калгасах каня няма каму падкаваць»), сувенірнымі ларкамі, сцежкай здароўя... Ёсць для гэтай мэты і добрая тэрыторыя ля возера, але ёсць і нехта, хто не хоча яе ўступаць... Спадзяюся, у рэшце рэшт гэтае пытанне будзе вырашана — ва ўсякім разе ў Міністэрстве культуры мяне запэўнілі, што цалкам падтрымліваюць майстра Дубіну і яго задуму.

І ўсё ж, калі па вялікаму рахунку, то Глыбокае ўжо цяпер з'яўляецца цэнтрам кавальства на Беларусі, цэнтрам, які набывае ўсё большую вядомасць. У гэтыя дні члены кааператыва «Дэкор» прымалі ўдзел у фестывалі кавалёў у Чэха-Славакіі.

Маргарыта СТАРЫХ.
Фота **Сяргея ГРЫЦА.**

День Союза

РОССИЙСКИЙ УГОЛЬ ПОЙДЕТ В МОЛДОВУ

Республиканское предприятие по обеспечению твердым топливом предложило жителям Молдовы, которые пользуются печным отоплением, приобретать уголь на зиму сейчас, не откладывая в долгий ящик. В связи с сокращением добычи сортовых углей в соседней Украине Молдова будет закупать его в России. Это в основном сортовой бурый уголь в брикетах из Канско-Ачинского бассейна и, по мнению специалистов, наиболее экологически чистый вид топлива.

ПАРТИЙНЫЕ АРХИВЫ НЕКОМУ СДАВАТЬ

В Хабаровске не могли выполнить указ Президента РСФСР о передаче партийных архивов. Заведующая архивным отделом Хабаровского крайисполкома Раиса Овчинникова сообщила, что «распоряжение о передаче партийного архива готово, однако для того, чтобы передача состоялась, нужны представители бывших хозяев, а их-то никак не могут найти. Директор партийного архива в отпуске, местонахождение управляющего делами крайкома неизвестно».

АХРОМЕЕВ СБИЛ САМОЛЕТ

Высокопоставленный генерал в отставке, пожелавший остаться неизвестным, сообщил, что был свидетелем того, как маршал Ахромеев приказал сбить южнокорейский лайнер в ночь на 1 сентября 1983 года.

Группа высших офицеров, в том числе маршал Ахромеев, находилась поздним вечером в кабинете начальника Генерального штаба маршала Огаркова. Шла коллективная подготовка его выступления на предстоящем пленуме ЦК КПСС. Зазвонил один из многочисленных телефонов. Трубку взял маршал Ахромеев, выслушал и сообщил Огаркову, что над Камчаткой и Сахалином летит неопознанный самолет. Огарков ответил, что следует все уточнить. Однако маршал Ахромеев, к удивлению присутствующих, приказал самолет сбить и положил трубку...

ВЫВЕДУТ ВОЙСКА!

Как заявил председатель правящей фракции ВС Латвии Янис Диневич, руководители республики проведут переговоры с представителями Министерства обороны СССР о сроках и механизме вывода советских вооруженных сил с территории республики. По его словам, на первоначальном этапе этого процесса советским войскам может быть предоставлен статус военных баз. Заместитель Департамента обороны Латвийской республики Аусеклис Плявиньш выразил мнение, что уже в ближайшие месяцы этот вопрос будет решен в ходе межгосударственных переговоров.

ПЕРЕВОРОТ УЛУЧШИЛ СВЯЗЬ С ПАРИЖЕМ

В последние дни разительным образом улучшилась телефонная связь между Парижем и Москвой, которая была в течение многих лет настоящей мукой для тех французов, кто хотел вызвать по телефону или связаться по телефаксу с московским корреспондентом. Линии были свободны только глубокой ночью, что никак не способствовало развитию ни деловых, ни чисто человеческих взаимоотношений Франции и СССР. На днях государственная служба связи «Франс-телеком» сообщила, что число телефонных каналов между двумя странами увеличено вдвое. В Париже считают, что в малом числе телефонных линий был заинтересован КГБ, так как большую сеть труднее подслушивать.

КОМПАРТИЯ ОБНОВЛЕННОГО ТИПА

Недавно закончил работу пленум ЦК компартии Таджикистана. После длительных и порой весьма ожесточенных дебатов, отразивших крайне полярные точки зрения коммунистов, участники пленума приняли заявление.

В нем говорится о полной самостоятельности компартии Таджикистана. Этот вывод, по логике заявления, вытекает из ложного положения, в которое были поставлены коммунисты Таджикистана ЦК КПСС, его Политбюро и Секретариатом, не выступив против совершенного в стране переворота.

О ПОВЫШЕНИИ ЦЕН НА НЕФТЬ

Комментируя заявления Бориса Ельцина и Ивана Силаева о предстоящем повышении внутренних цен на нефть, бывший советник Президента СССР, директор Института проблем рынка АН СССР Николай Петраков сказал: «Мне кажется, это популистское заявление, хотя, безусловно, цены на нефтепродукты у нас низкие. Но, может быть, надо было бы сначала пойти на то, чтобы отменить все налоги, которые влияют на уровень цен, и оставить всю прибыль в регионах. Вот если ее будет недостаточно, тогда и рассмотреть вопрос о ценах. Ведь в цены можно «загнать» все что угодно — любую старую технологию, любую налоговую систему, а потребитель будет за это отдуваться».

ТАСС — «Инфо-нова».

Роздум пісьменніка

СВЯТКАВАЦЬ ПЕРАМОГУ ЯШЧЭ РАНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Самае галоўнае — дэмакратычныя заваёвы не сталі незваротнымі і ў любы момант могуць быць растаптанымі і знішчанымі. Праявілася і сіла, якая прагне гэтага,—самая артадаксальная частка кіраўніцтва Камуністычнай партыі, КДБ, МУС, арміі і ваенна-прамысловага комплексу. Планы, намеры відавочныя: не дапусціць развіцця дэмакратыі, глыбокіх эканамічных рэформ, захаваць сваё прывілеяванае становішча ў грамадстве, рэанімiраваць і яшчэ больш узмацніць у краіне таталітарызм.

Але не менш важнае — народ, які адчуў сябе, хоць і не да канца, але гаспадаром свайго жыцця, які пачаў выпростваць свае плечы, назад у рабства загнаць не па сілах нікому.

Добра, што мы ўбачылі маральнае аблічча людзей, якія намі кіруюць. І на наступных выбарах будзем больш уважлівыя і прынцыповыя ў сваім галасаванні.

З самага пачатку авантуры стала ясна, што пераварот робіцца злачынцамі. І да гэтага асобы, якія ўвайшлі ў так званы дзяржаўны камітэт па надзвычайнаму становішчу, былі непапулярныя ў народзе ў сілу сваёй шэрасці, прыходу на высокія кіруючыя пасты пад націскам, пасля «выкручвання рук» дэпутатам. Зараз яны праявіліся ў поўнай «красе». Зварот «васьмёркі» да народа з папулісцкімі бездапаможнымі дэкларацыямі быў успрыняты як чыстай вады дэмагогія. Мы такога ўжо начыталіся і наслухаліся. Скажам, ад былога саюзнага прэм'ера М. Рыжкова, ад высокапастаўленых партыйных чыноўнікаў В. Ніканава, А. Біруковай, якія амаль кожны месяц раз'язджалі па замежжы, вывучаючы перадавы вопыт, а потым у шматлікіх інтэрв'ю расказвалі, як яны накормяць, апрануць і абуюць народ. Дзе яны зараз? Раскашуюцца на шыкоўных дачах, пабудаваных за народныя грошы, а затым выкупленых імі за бясцэнак. Страшна становіцца, калі падумаеш: колькі ж такіх і меншых рангам персанальнікаў сядзіць на народным карку!

Хто ж ім — былым і сённяшнім адказным кіраўнікам — не даваў рашаць харчовую і жыллёвую праграмы, хто перашкаджаў змагацца з карупцыяй, мафіяй, злачынным светам або даць гарадскому насельніцтву для садова-агародных работ гэтыя злашчасныя 0,15 гектара і г. д.? Тыя, хто займаўся разбурэннем эканомікі, хто зрабіў народ жабраком, хто ўзвінціў цэны ў 5—6 разоў, зараз абяцаюць іх замарозіць або знізіць. Смешна! Ніякай праграмы вывядзення краіны з крызісу ў прадстаўнікоў «надзвычайкі» не было. Затое ў змоўшчыкаў білі праз край выключна цынічнае нахабства, тупое самалюбства, амбіцыі. Але праз усё гэта праступаў страх. Не, не дарма на прэс-канферэнцыі дрыжалі рукі, шарэлі твары ў авантурыстаў, не дарма неўзабаве хапіў крыз высокапастаўленага путчыста. Яны добра ведалі, што робяць злачынства, за якое давядзецца адказваць, але спадзяваліся, як і ранейшыя змоўшчыкі, на апатыю, рабскую пакорлівасць народа. Некалькі гадоў назад гэтая авантура, магчыма, і завяршылася б паспяхова. Толькі не сёння. Народ ужо не той. Выйшла асечка.

У час перавароту прайшло праверку шырока дэкларуемае адзінства арміі і народа. Састарэлыя і маладзейшыя генералітэтчыкі кінулі ў крывавую прорву маладых хлопцаў, салдат, ачмураных артадаксальнай камуністычнай армейскай прапагандай. Лампаснікам, якія дзесяцігоддзямі сядзяць пры поўным карыце, ёсць што губляць: асабістыя самалёты, якія абслугоўваюць не толькі іх, але і дамачадцаў, агромністыя кватэры, шматгектарныя дачы, машыны, прыслугу і г. д. А за што ж павінны ісці супраць свайго народа салдаты, якія заўтра здымуць пагоны і стануць тым жа народам? Але ж, хоць і не па сваёй віне, пад прымусам загадаў і ў сілу свайго няведання сітуацыі (ім спецыяльна не ставілі адразу задачу!), пайшлі. Добра, што яны не адкрылі масіраваны агонь па безабаронных людзях. Ды ўсё вісела на валаску. Магла праліцца вялікая кроў.

Падзеі перавароту паказалі, што неабходны тэрміновыя дэпартызацыя і рэарганізацыя арміі. Яна павінна ачысціцца ад састарэлых «палкаводцаў», быць прафесіянальнай і выконваць толькі свае задачы, не становіцца які ўжо раз марыянеткай у руках змоўшчыкаў, палітыканаў любой афарбоўкі. Гэта тычыцца таксама КДБ і МУС.

Пераварот высвеціў сапраўдны твар дзвюх сіл: і кансерватараў, і дэмакратаў. Увесь час кансерватыўная кіруючая вярхушка палохала народ грамадзянскай вайной, да якой нібыта падштурхоўваюць наша грамадства дэмакраты. А цяпер мы ведаем, хто спрабаваў развязаць вайну са сваім народам, працягваючы крыважэрныя сталінскія традыцыі.

Беларусь была на перыферыі падзей, але і для яе пераварот стаў экзаменам, праверкай хто ёсць хто. У той час, калі многія рэгіёны Расійскай Федэрацыі (пераважная большасць!) аказалі актыўнае супраціўленне хунце, наша нібыта суверэнная рэспубліка паказала сваю поўную бездапаможнасць перад чорнай сілай, якая ўзнікла на даляглядзе з боку цэнтра. Яна, нібы вайсковае падраздзяленне пад камандай партыйных «генералаў», узяла пад казырок і паспяшалася папярод бацькі ў пекла, каб выканаць загады дзяржаўных злачынцаў.

Канешне ж, у падтрымцы хунты з боку Бюро ЦК Кампартыі Беларусі, за што яму давядзецца несці адказнасць, нічога дзіўнага няма. Гэтага можна было чакаць. А вось нерашучую, сарамяжлівую рэакцыю Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР на ўвядзенне ў краіне дыктатуры зразумець нельга. Наш вышэйшы орган улады не адгукнуўся на патрабаванне парламенцкай апазіцыі даць праўдзівую ацэнку падзеям, не выказаў рашучы пратэст супраць хунты, якая пераступіла праз волю беларускага народа, якая растаптала дэклараваны суверэнітэт Беларусі, якая, урэшце, хацела адабраць уладу ў яго самога, у абраных народам парламентарыяў.

У апошніх падзеях трэба яшчэ сур'ёзна разбірацца. Хунта прытупнула, і на некалькі дзён суверэнная рэспубліка анямела, аглухла і аслепла. Чаму замоўкла наша радыё і тэлебачанне? Хто заціснуў рот дэмакратычнай прэсе? На гэтыя і многія іншыя пытанні мы павінны атрымаць адказ.

Мы, беларусы, убачылі, што папяровым суверэнітэтам, як фігавай лісцінкай, ад агрэсіі, ад дыктатуры з цэнтра не прыкрыешся, не абаронішся. Нам патрэбен сапраўдны суверэнітэт.

Нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР, скліканая па патрабаванню апазіцыі, пасля сапраўды геранчых намаганняў усіх дэмакратычных сіл парламента прыняла пастановы аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ — КПСС на тэрыторыі рэспублікі, аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларусі. Гэта вялікая перамога!

Аднак у час работы сесіі выявіліся і выключная агрэсіўнасць, ваяўнічае непрыняцце разумных прапаноў так званай пераважаючай большасцю, парламенцкім «партыйна-гаспадарчым актывам». Гэтыя людзі ўжо не кляліся ў вернасці камуністычным ідэалам, пад імі, як і раней, яны мелі на ўвазе сваю неабмежаваную ўладу і поўнае карыта. Тыя, хто сядзеў ля экранаў тэлевізараў, убачылі, як адбывалася гэтае «карытнае змаганне»: упартасць, зацятасць і разам з тым (трэба аддаць ім належнае!) — незвычайная выдумка, уменне лавіраваць, выкручвацца з любой сітуацыі. Вось бы гэтыя якасці ды на добрую справу! Мінчан, прадстаўнікоў Оршы, Полацка, Наваполацка, Салігорска, Мазыра і іншых гарадоў, якія сабраліся на плошчы перад парламентам, у сваіх прамовах некаторыя дэпутаты грэбліва іменавалі «натоўпам». Іх настрой быў усё ж сапсаваны, калі на трыбуну сесіі падняўся прадстаўнік страйкамаў і сказаў сваё важкае, рашучае, рабочае слова.

Шкада, што экраны тэлевізараў не паказалі «ваяўнічых» дэпутатаў у той сітуацыі, калі тысячы людзей на плошчы скандзіравалі: «Хун-та!», «Ха-лу-і!», «Да-лоў!», «За-ба-стоў-ка!», а яны, угнуўшы галовы ў плечы, спалохана беглі да персанальных машын. Не, шаноўныя, вы памыляецеся! Натоўпу на плошчы не было, гэта быў народ!

Сёння стала дыхаць крышку лягчэй, ды не трэба расслабляцца. Яшчэ рана святкаваць перамогу, таму што гарыць кроў бязвінных людзей на тбіліскім, вільнюскім, рыжскім, а зараз і на маскоўскім асфальце. Не дай Бог, каб яна зачырванела на мінскім!

Рана, таму што карані сталінізму надзвычай жывучыя, таму што і сярод нас застаюцца рэакцыянеры: старыя і маладыя, яўныя і тайныя. Адны з іх праходжваюцца або сядзяць на лавачках у скверах, другія — засядаюць у саветах ветэранаў, трэцяя — маюць дэпутацкія мандаты, займаюць адказныя пасады, прытым усюды і на ўсіх узроўнях. Яны ўжо задаволена пацiралі рукі, гатовыя павесці масіраваную атаку на дэмакратыю, ды не ўдалося. Зараз сталіністы да пэўнага часу прыціхнуць, але ніколі яны не пераменяцца.

Рана, таму што ў нас ёсць свае янаевы і паўлавы, кручковы і пугі, язавы і бакланавы, цізяковы і старадубцавы. Ёсць жырыноўскія і андрэевы. Яны такія ж шэрыя, але не менш цынічныя, нахабныя і агрэсіўныя. Яны пастараюцца выкарыстаць любую магчымасць, каб пайсці ў наступ, зрабіць Беларусь «бананавай рэспублікай» з усімі яе пачварнымі атрыбутамі.

Рана, таму што ўсё можа паўтарыцца, толькі па больш вытанчаным і дасканалым у сваёй жорсткасці сцэнарыі.

Улічваючы ўрокі перавароту, беларускі народ павінен рашуча асудзіць тых, хто дапамагаў хунце надзець на яго хамут дыктатуры, смела выступіць на абарону дэмакратыі і сваёй незалежнасці. Мы помнім згуртаванасць і рашучасць рабочых Мінска і іншых гарадоў рэспублікі ў красавіку гэтага года. Думаецца, што кавалак каўбасы не стане для нашага народа даражэй свабоды, годнасці і сумлення. Наперадзе цяжкая праца. І перамогу святкаваць яшчэ рана.

Сяргей ЗАКОННІКАЎ,
галоўны рэдактар часопіса «Полымя».



ЗАРУБЕЖЬЕ

Яйца без сальмонеллы?

САН-ФРАНЦИСКО.

Потребление яиц в США сократилось почти вдвое после второй мировой войны и на 8 процентов после 1985 года. Одна из причин отказа населения от потребления яиц — боязнь заразиться сальмонеллой, которая попадает от больной несушки в яйцо до того, как оно покроется скорлупой.

Американская компания (Бон дент интернэшнл) в городе Лиден, штат Вашингтон, разработала технологию по «гиперпастеризации» яиц с помощью кислорода, закачиваемого через скорлупу под давлением. После этого яйца помещают в инертный газ и герметически закрывают. Нанесенная на скорлупу зеленая пометка краснеет, если покрытие нарушается.

Демонтирован памятник Тито

БЕЛГРАД.

В городе Ужице (Республика Сербия), до недавнего времени носившем название Титово-Ужице, демонтирован памятник основателю социалистической Югославии И. Б. Тито. Бронзовая фигура маршала, простоявшая на центральной площади более 30 лет, под аплодисменты присутствующих была снята с постамента и отправлена в одно из хранилищ, где уже нашли свое место многочисленные памятники и бюсты вождя.

Местная организация ветеранов войны заявила по этому поводу протест властям.

Наркобизнес в Панаме

ПАНАМА.

